Л. С. ІВАНОВА

# КАЛЬВІНІСЦКІ ЗБОР У СВІСЛАЧЫ (XVII ст.)

Рэфармацыя пачала распаўсюджвацца ў Вялікім Княстве Літоўскім з сярэдзіны XVI ст. Ідэі Рэфармацыі, асабліва на яе пачатковым этапе, успрыняла найбольш уплывовая, палітычна актыўная шляхта. Адным з першых магнатаў, якія далучыліся да Рэфармацыі, быў віленскі ваявода, канцлер ВКЛ Мікалай Радзівіл Чорны. З яго імем звязана распаўсюджанне і арганізацыя рэфармацыйнай царквы ў ВКЛ. Першы збор у Беларусі быў заснаваны ў 1553 г. на замку Радзівіла ў Берасці, першы збор у Вільні знаходзіўся ў палацы Радзівіла на Лукішках. Найбольшае распаўсюджанне ў Беларусі (і ва ўсёй Рэчы Паспалітай) атрымаў кальвінізм. Да канца XVI ст. у асноўным склалася арганізацыйная структура кальвінісцкай царквы. Літоўская правінцыя (у якую ўваходзілі тэрыторыі сучаснай Беларусі, Літвы і Падляшша) у пачатку XVII ст. складалася з шасці дыстрыктаў: Віленскага, Завілейскага, Наваградскага, Рускага, ці Беларускага, Берасцейскага, ці Падляшскага і Жамойцкага [3, с. 24]. Спачатку збор у Свіслачы адносіўся да Наваградскага дыстрыкту, а з 1627 г. разам са зборамі ў Сяльцы і Петухове перададзены ў Падляшскі дыстрыкт [4, с. 19]. Арганізацыйным і кіруючым цэнтрам Літоўскай правінцыі быў Віленскі евангеліцка-рэфармацыйны сінод. К канцу XVI ст. перамога контррэфармацыйных тэндэнцый, ідэалагічная слабасць і ўнутраны раскол падарвалі пазіцыі рэфармацыйнага руху. Аднак у першай палове XVII ст. кальвінісцкая царква ў ВКЛ захоўвала пэўную стабільнасць унутранага жыцця. Кальвінісцкая шляхта ў ВКЛ знаходзілася пад абаронай артыкулаў Варшаўскай канфедэрацыі 1573 г. і без асобых перашкод утрымлівала і закладвала новыя зборы ў сваіх уладаннях. Разам з тым, у выніку рэлігійных канверсій фундатараў, ці патронаў, зборы пераходзілі да каталікоў.

Збор у Свіслачы, верагодна, быў заснаваны каля 1620 г. жыжморскім старастам Себасціянам Пакашам. Род Пакашаў паходзіў з Малой Польшчы, яго прадстаўнікі асталяваліся ў ВКЛ у канцы XVI [8, с. 238; 9, с. 175–176]. Себасціяна Пакаша як свайго вернага і добразычлівага шляхецкага слугу згад-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вае ў тэстаменце ад 4 жніўня 1599 г. віленскі ваявода, гетман ВКЛ Крыштоф Радзівіл Пярун [5, с. 87, с. 94]. Пазней Пакашы ўваходзілі ў кліентуру сына Пяруна – Крыштофа ІІ Радзівіла.

У актах Віленскага сіноду 1618 г. адзначана, што Пакаш звяртаўся да Сіноду з просьбай прыслаць міністра[1] [3, с. 47], але незразумела, да якога збору, бо ён быў таксама фундарам збору ў Прамежы (Ковенскі павет)[2], які на той час ужо існаваў [3, с. 33]. Збор у Свіслачы і яго міністр Мацей Кошыба згадваюцца на Сінодзе ў 1624 г. [3, с. 90]. Як вынікае з актаў Віленскага сіноду, Пакаш быў актыўным членам евангелічнай абшчыны. У 1615 г. Віленскі сінод выказаў яму падзяку за абяцанне даць тысячу злотых і две валокі на друкарню[3], а таксама збудаваць дом для друкара на сваім грунце [3, с. 32]. Жонка Себасціяна Пакаша ў 1618 у тэстаменце запісала трыста злотых на Віленскі збор [3, с. 46]. Часам актыўнасць Пакаша абарочвалася пэўным свавольствам. У 1620 г. на Віленскім сінодзе выказвалася занепакоенасць з той нагоды, што Пакаш без санкцыі Сіноду мае намер запрасіць у свае зборы міністраў з Польшчы. Было вырашана паслаць да яго камісію з паважаных святароў, каб перасцерагчы яго ад парушэння царкоўнай дысціпліны [3, с. 59]. У 1624 г. Сінодам прызначана камісія для рэвізіі бібліятэкі Себасціяна Пакаша ў Свіслачы, а сам ён згадваецца ўжо як нябожчык [3, с. 90].

Кальвіністамі былі і сыны Себасціяна Пакаша – Вацлаў і Себасціян. Іх патрон, гетман ВКЛ Крыштоф ІІ Радзівіл адчуваў пэўную адказнасць за дзяцей сваёй кліентуры, асабліва за іх веравызнанне. Пасля смерці іх бацькі ў Свіслач быў пасланы Радзівілам слуга, каб сіроты не трапілі ў рукі «чужых» ці езуітаў [6, с. 188]. У 1634 г. Вацлаў Пакаш падараваў бібліятэку свайго бацькі разам з рэестрам кніг Віленскаму збору [4, с. 116]. Себасціян Пакаш малодшы быў таксама патронам збору ў Свіслачы. У лісце ад 12 чэрвеня 1633 г. ён пісаў Сіноду, што пасля смерці Мацея Кошыба збор у Свіслачы не мае сталага міністра і прасіў прыслаць міністра з Прамежы Паўла Гдоўскага. З-за недахопу святароў Сінод часам дазваляў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

[1] Пратэстанцкі святар.

[2] Тэрыторыя сучаснай Літвы.

[3] Невядома, гаворка ідзе пра перспектыву стварэння новай рэфармацыйнай друкарні, ці аб якой-небудзь з існуючых.

міністрам адпраўляць свае абавязкі ў некалькіх зборах. Пакаш адзначаў, што гарантуе новаму міністру такі ж даход («кандыцыю»), які меў яго папярэднік. У лісце таксама змяшчаецца даволі загадкавая просьба прыслаць святара, які б ведаў літоўскую мову [1, с. 511]. Магчыма, у наваколлях Свіслачы з даўніх часоў захаваліся літоўскія пасяленні. Аднак, хутчэй за ўсё, святар з літоўскай мовай быў патрэбен для літоўскага насельніцтва збора ў Прамежы. Сінод выканаў просьбу патрона, у 1633 г. у Свіслач былі пасланы міністар Гдоўскі, а ў Прамеж – міністар Барановіч [4, с. 111].

У 1635 г. Себасціян Пакаш за даўгі аддаў у заставу гданьскім мяшчанам Рудольфу і Даніэлю Ван дэр Рэнам свой спадчынны маёнтак Свіслач з усімі да яго належачымі фальваркамі, землямі, падданымі і іх павіннасцямі, у тым ліку і мястэчка са зборам і плябаніей. Маючы патрэбу ў грошах, будучы абцяжараны крэдытамі, у 1636 г. Ван дэр Рэны перадалі Свіслач у заставу Крыштофу Крышпіну Кіршэнштэйну, каралеўскаму двараніну, паюрскаму старасце [2, с. 1329]. Верагодна, з гэтага часу перастаў дзейнічаць збор у Свіслачы. Пакашы заставаліся кальвіністамі і ў XVIII ст., пад іх апекай дзейнічаў збор у Прамежы [7, с. 100].

---


*1.* Аддзел рукапісаў бібліятэкі Літоўскай акадэміі навук імя Урублеўскіх. Ф. 40.

*2.* Аддзел рукапісаў Літоўскай нацыянальнай бібліятэкі імя М. Мажвідаса. Ф. 93.

*3.* Akta synodów prowincjonalnych Jednoty Litewskiej 1611–1625. – Wilno, 1915.

*4.* Akta synodów prowincjonalnych Jednoty Litewskiej 1626–1637.Wstęp i opracowanie Marzena Liedke i Piotr Guzowski. – Warszawa, 2011.

*5. Augustyniak, U.* Testamenty ewangelików reformowanych w Wielkim Księstwie Litewskim / U. Augustyniak. – Warszawa, 1992.

*6. Augustyniak, U.* Dwór i klientela Krzysztofa Radziwiłła (1585–1640). Mechanizmy patronatu / U. Augustyniak. – Warszawa, 2001.

*7. Kriegseisen, W.* Ewangelicy Polscy i Litewscy w epoce saskiej (1696–1763) / W. Kriegseisen. – Warszawa, 1996.

*8. Niesiecki, K.* Herbarz Polski / K.Niesiecki. – T. 7. – Lipsk, 1841.

*9. Uruski, S.* Rodzina. Herbarz szlachty polskiej / S. Uruski. – T. 13. – Warszawa, 1916.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ